Источник: "Літаратура і мастацтва" - 2013-02-01

# Заўсёды маладая «Паўлінка»

**У мінулым годзе «Паўлінка» Янкі Купалы адзначала свой юбілей — 100 гадоў з часу напісання. 2013-ы таксама для яе юбілейны: 100 гадоў таму, у 1913 годзе, «Паўлінка» выйшла з друку асобнай кніжкай і ўпершыню была пастаўлена на сцэне.**



**Алена ЯЦЫНА**

А пачыналася ўсё з Акопаў, куды Янка Купала прыехаў да маці на адпачынак у канікулярны час. Тут ён пачаў пісаць твор, у аснову якога леглі рэальныя падзеі, якія аддбыліся на Лагойшчыне. Прататыпам Паўлінкі стала вясковая прыгажуня Ядвіга Аўлачымская. Яна жыла недалёка ад Акопаў. А вось характар гераіні, як сцвярджаюць некаторыя даследчыкі, Купала спісаў з Паўліны Мядзёлкі, з якой пазнаёміўся ў 1908 годзе. Ён закахаўся ў дзяўчыну, нават прапаноўваў ёй руку і сэрца, але красуня адмовіла пісьменніку.

На пачатку 1913 года камедыя пабачыла свет асобнай кніжкай. І вельмі хутка, 27 студзеня, у Вільні адбылася прэм'ера спектакля, які ажыццявіў Беларускі музычна-драматычны гурток на чале з Барысам Даніловічам. У газеце «Наша Ніва» 1 лютага з'явілася нататка: «Вечарынка была незвычайная: ставілі на сцэні першы раз «Паўлінку» сцэнічны абразок у двох актах Янкі Купалы... У залі у часе гульні панаваў дзіўны настрой: вось здавалася, што гэта адна, згодная семейка сабралася на нейкае мілае свята, гэтак усім было вясёла і міла». Пасля спектакля Янка Купала атрымаў падарунак — залаты гадзіннік з надпісам «Аўтору «Паўлінкі» віленскія беларусы 27 студзеня 1913 г.». Артыстцы Маркевічанцы, якая выконвала ролю Паўлінкі, Купала падаў на сцэну букет жывых кветак.

Праз дванаццаць дзён п'есу пабачылі ў Пецярбургу. Прадставілі яе студэнты навукова-літаратурнага гуртка Пецярбургскага ўніверсітэта. На пастаноўку іх натхніў сам аўтар. За арганізацыю спектакля ўзяўся вялікі энтузіяст тэатральнага мастацтва Уладзіслаў Эпімах-Шыпіла. Бэкін-Драздоў — акцёр Александрыйскага тэатра — быў запрошаны ў якасці рэжысёра.

Ролю Паўлінкі выконвала дваццацігадовая Паўліна Мядзёлка. У яе ўсё атрымоўвалася, акрамя любоўных сцэн. Паўліна хвалявалася і крыўдзілася на рэжысёра з Купалам, якія з усмешкай абмяркоўвалі гэты момант. І аднойчы, калі Купала прыйшоў да яе ўвечары і памкнуўся сыграць ролю Якіма, Паўліна абурылася: «Ты што, прыходзіш рэпетыцыю праводзіць са мной, вучыць мяне цалавацца? Абыдуся без тваіх урокаў!»

У Пецярбургу камедыя прыйшлася даспадобы гледачам. П. Мядзёлка выканала сваю ролю так, што ў зале доўга не змаўкалі авацыі. А Янка Купала, усхваляваны, моцна сціснуў яе ў абдымках.

У Беларусі першымі пабачылі п'есу жыхары мястэчка Радашковічы ў 1915 годзе, паставіў яе Фларыян Ждановіч — беларускі акцёр, рэжысёр і грамадскі дзеяч. Ролю Паўлінкі выконвала Аляксандра Ліпніцкая. У пастаноўцы Фларыяна Ждановіча камедыя гастраліравала па беларускіх гарадах і мястэчках.

На сцэне Беларускага дзяржаўнага тэатра (цяпер Нацыянальны акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы) п'есу ігралі 17 верасня 1920 года.

Сённяшняя «Паўлінка» ідзе ў знакамітай пастаноўцы Льва Літвінава. Прэм'ера спектакля адбылася ў 1944 годзе ў Томску, дзе тэатр знаходзіўся ў эвакуацыі. Амаль трыццаць гадоў у ролі Паўлінкі выходзіла на сцэну Раіса Кашэльнікава. Яна іграла 19-гадовую дзяўчыну, нават калі ёй было 40. Цікава, што яе Паўлінка ўпершыню заспявала. Для Раісы Мікалаеўны спецыяльна была напісана вакальная партыя. Па ёй і сёння падбіраюць выканаўцаў на ролю Паўлінкі. Гэта няпростая справа, бо Паўлінцы трэба ўзяць высокую ноту — соль другой актавы.

Пераемніцай Раісы Кашэльнікавай стала Ала Доўгая. Яе Паўлінку называлі ўзнёслай і летуценнай. Яна была настолькі папулярнай, што вобраз гэты быў змешчаны на каробках з цукеркамі. Лісты ад прыхільнікаў артыстка атрымлівала мяхамі, юнакі пісалі: «Вось бы сустрэць такую дзяўчыну, як Паўлінка!»

З 1982 па 2000 год у ролі Паўлінкі выходзіла на сцэну Зоя Белахвосцік — заслужаная артыстка Рэспублікі Беларусь. Дарэчы, Зоя Валянцінаўна — унучка Глеба Глебава, народнага артыста СССР. У спектаклі ён іграў Пранцыся Пустарэвіча. На выкананне гэтай ролі Глебам Паўлавічам раўняюцца акцёры ўсіх пакаленняў, але многіх знаходак артыста паўтарыць не могуць. Напрыклад, калі яго падвыпіўшы герой упершыню з'яўляўся на сцэне, ён, не азіраючыся, закідваў свой картуз на цвік у сцяне хаты бацькоў Паўлінкі.

У Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы сёння Паўлінку іграюць чатыры актрысы: Юлія Шпілеўская, Святлана Зелянкоўская, Валянціна Гарцуева і Кацярына Яворская.

Гаворачы пра «Паўлінку», нельга не ўспомніць Сцяпана Бірылу — народнага артыста БССР. У тэатры яго называлі «лордам-захавальнікам» спектакля. 30 гадоў ён падбіраў акцёраў для пастаноўкі. Аднойчы сам сябе прызначыўшы асістэнтам рэжысёра, сачыў, каб спектакль захоўваўся ў першапачатковым выглядзе, уводзіў у матэрыял пачаткоўцаў і заўсёды больш за ўсіх хваляваўся за пастаноўку. А сам ў «Паўлінцы» ніводнага разу так і не сыграў.

Цікава, што першыя касцюмы ў тэатры да п'есы былі зроблены па эскізах Оскара Марыкса, які з'яўляецца заснавальнікам прафесійнага беларускага тэатральна-дэкаратыўнага мастацтва і першым беларускім тэатральным мастаком.

Тысячны паказ спектакля адбыўся ў верасні 1980 года.

Сёння «Паўлінкай» распачынаецца кожны тэатральны сезон Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы.

Супрацоўнікі Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Якуба Коласа НАН Беларусі падрыхтавалі мультымедыйную прэзентацыю, прысвечаную 100-гадоваму юбілею «Паўлінкі», яе можна пабачыць на сайце бібліятэкі http://csl.bas-net.by.

Алена Яцына. Заўсёды маладая «Паўлінка»